УДК 811.161.3

*Т.І. ЯКУБОВІЧ*

# ДА ПЫТАННЯ КОНФІКСНАГА СЛОВАЎТВАРЭННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Слоўнікавы запас беларускай мовы бясконца змяняецца, развіваецца, адлюстроўваючы ўсё новае (з'явы, паняцці), што датычацца жыцця народа і грамадства. Адным з найбольш важных сродкаў узбагачэння лексікі з'яўляецца дэрывацыя (*ад лац. d*erivatio – адвядзенне). Новыя словы часта ўзнікаюць на

архив библиотеки МГУ имени А.

базе ўласнага моўнага матэрыялу пры дапамозе розных спосабаў дэрывацыі паводле існуючых у мове словаўтваральных узораў. Адным з найбольш цікавых з'яўляецца конфікснае словаўтварэнне ў словаўтваральных гнёздах з зыходнымі назоўнікамі.

Конфікс (*ад лац.* konfixum – разам узятае) – састаўны афікс (прыстаўка і суфікс), які выкарыстоўваецца як словаўтваральны сродак [6, с. 72]. Паводле думкі вядомага лінгвіста Л.М. Шакуна, "конфіксам лічыцца састаўная службовая марфема, якая складаецца з прыстаўкі і суфікса, што адначасова, у комплексе далучаюцца да асновы пры ўтварэнні слова" [8, с. 33]. Пры канфіксацыі да ўтваральнай асновы адразу далучаюцца першы кампанент конфікса (падобны да прыстаўкі ці прыстаўка) і другі кампанент (суфікс). Кампаненты дадзенага фарманта не маюць незалежнага словаўтваральнага значэння, а толькі падтрымліваюць словаўтваральныя магчымасці адзін другога, напрыклад: у словах ***пад**-група (група), **пры**-гарад (горад), бурач-**нік** (бурак), мар-**ак** (мора)* прэфіксы ***пад-, пры-,*** суфіксы ***-нік, -ак*** маюць самастойнае словаўтваральнае значэнне, паколькі пры дапамозе іх у кожным з названых прыкладаў утвараюцца новыя словы (прэфіксацыя і суфіксацыя), а ў вытворных ***пад**-ветр-**ан**-ы (пад ветрам), **пры**-вак-заль-**н**-ы (пры вакзале), **пад**-акон-**нік** (пад акном), **уз**-гор-**ак** (уз гару)* ***пад- – -ан-, пры- – -н-, пад- – -нік, уз- – -ак-*** – гэта не асобныя марфемы, а толькі састаўныя часткі службовай марфемы (канфіксацыя). Першы і другі кампаненты конфікса выступаюць сумесна, як адзіны словаўтваральны сродак, з двух бакоў акружаюць утваральную аснову, па гэтай прычыне конфікс яшчэ называюць і цыркумфіксам (ад лац. circum – круг і fixus – прымацаваны).

У мовазнаўстве, разглядаючы конфікснае словаўтварэнне, ужываюць тэрміны прыстаўка і суфікс замест больш дакладных першы і другі кампаненты конфікса. Такое ўжыванне тэрмінаў дапушчальнае з пункту погляду структурных адносінаў, таму што конфіксы (цыркумфіксы) складаюцца з элементаў, якія фігуруюць у мове як асобныя прыстаўкі і суфіксы. Аднак неабходна ўлічваць, што першы кампанент не зусім прыстаўка, а толькі фарміруючы элемент, пераходная ступень на шляху ператварэння прыназоўніка ў прыстаўку. Таму конфікс – гэта вядомая прыстаўка і вядомы суфікс (або два суфіксы, апошні з якіх – постфікс), напрыклад: ***пра**-ветр-**ы**-*(ц)***ца*** *← вецер, з-жал-**і**-(ц)**ца** ← жаль.*

Як вядома, поўнай тоеснасці паміж названымі двума кампанентамі і асобнымі прыстаўкамі і суфіксамі няма: яны адрозніваюцца здольнасцю функцыянаваць ў складзе конфіксаў і словаўтваральным значэннем. Адзінства конфіксаў не матэрыяльнае, а толькі функцыянальнае. Адметнасць іх у тым, што прыстаўкі і суфіксы выкарыстоўваюцца адначасова ў адзіным словаўтваральным акце, як бімарфемы, а не паслядоўна – спачатку адзін, а затым другі. Вельмі рэдка выступаюць у якасці першага кампанента конфікса такія прыстаўкі, як ***ад-, пера-, уз- (ус-), між-*** *(ад-вячор-ак, між-планет-н-ы, пера-лес-ак, уз-меж-ак)* і зусім не ўжываюцца пры дэрывацыі субстантываў ад назоўнікаў (прэфіксальным спосабам). Другім кампанентам часцей за ўсё выступаюць больш прадуктыўныя суфіксы назоўнікаў і прыметнікаў **-ак, -к-; -н-, -ан-, -ав-** і інш., аднак значэнне марфем вельмі аслабляецца, яны нават дэсемантызуюцца. Асноўная роля такіх суфіксаў у конфіксных субстантывах – аднясенне назоўніка да аднаго з трох граматычных родаў. Ролю родавага кваліфікатара могуць выконваць **-ак, -іц-(-ыц-)** і **-j-**: *уз-лес-**ак**, уз-лесс-е (уз-лес [-j- э] ), бяс-хмар-**ыц**-а, бяс-хмар'-е ( бяс-хмар[-j- э]).* Прыведзеныя пары вытворных слоў маюць аднолькавую матывацыю і лексічнае значэнне. Канфіксацыю ў такіх і падобных выпадках можна разглядаць як суфігураванне прыназоўнікава-іменнага спалучэння слоў: *без вады → бязводдзе, пад печкай → падпечак, пад вадой → падводны, перад вясной → перадвеснавы.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Не адносяцца да конфіксаў такія вытворныя службовыя марфемы, як прыстаўкі **абяз-(абяс-, абез-, абес-)**, **неда-** (першыя кампаненты конфікса); суфіксы **-оўск-(-еўск-),** суфіксы з постфіксамі **-і-цца (-ы-цца),** іх мэтазгодна разглядаць як складаныя (вытворныя) афіксы.

Кожная службовая марфема мае пэўнае (праўда, гістарычна-зменлівае) кола слоў або асноў, з якімі яна здольна спалучацца, утвараючы новыя лексічныя адзінкі. Конфіксы маюць сваю спецыфічную сферу, у якой яны ў працэсе дэрывацыі праяўляюць сябе як значымыя часткі слова, але адны з іх маюць шырокія і багатыя марфематычныя сувязі, а другія – абмежаваныя і аднастайныя. Гэта тлумачыцца тым, што ў беларускім слове ўтваральная аснова з'яўляецца яго семантычным і структурным цэнтрам: яна мае намінатыўнае значэнне, якое з'яўляецца матывуючым для наступных вытворных. З утваральнай асновы пачынаецца рост словаўтваральнага гнязда – значыць, яна дыктуе і выбар наступных звенняў (конфіксаў) у словаўтваральным ланцужку. Часцей за ўсё конфіксы служаць для ўтварэння назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў і прыслоўяў, далучаючыся да зыходнай асновы назоўнікаў на першай (І), радзей да вытворнай адсубстантыўнай асновы прыметнікаў на другой (ІІ) ступенях словаўтваральных ланцужкоў.

Многія з даследчыкаў сучаснай беларускай мовы звярталіся да конфікснага словаўтварэння. Нас у дадзенай працы цікавіць перш за ўсё ўзаемадзеянне і выдзяленне словаўтваральных тыпаў конфіксных дэрыватаў у сістэме назоўнікаў, прыметнікаў і дзеясловаў у асноўным на першай і другой ступенях у словаўтваральных гнёздах з зыходнымі назоўнікамі. У многіх выпадках адзін і той жа дэрывацыйны сродак аб'ядноўвае некалькі словаўтваральных тыпаў, у кожным з якіх утвараюцца дзеясловы са сваім уласным словаўтваральным значэннем. Словаўтваральны тып, як вядома, гэта фармальна-семантычная схема пабудовы вытворных слоў пэўнай часціны мовы без аналізу іх канкрэтных уласцівасцей. Даць поўны пералік словаўтваральных тыпаў складана, таму за аснову іх выдзялення мы бралі характар словаўтваральнага сродка (конфікса) без уліку словаўтваральнага значэння дэрыватаў, адзначалі некаторыя марфаналагічныя змены на стыку матывавальнай асновы з другім кампанентам конфікса пры ўтварэнні новай лексемы.

У сістэме назоўнікаў можна выдзеліць словаўтваральныя тыпы субстантыўных дэрыватаў (каля пятнаццаці) з наступнымі конфіксамі (у адпаведных тыпах з аднолькавымі першымі кампанентамі выдзяляем падтыпы, што адрозніваюцца другім кампанентам):

***а- – -ак**: а-сіл-ак;* ***а- – -нік**: а-шый-нік;* ***а- – -ец**: а-кра-ец;*

***ад- – -ак**: ад-вячор-ак;* ***ад- – [-j- э]**: ад-гор'-е;*

***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -к-**: бес-казыр-к-а, без-рукаў-к-а;* ***без-(бес-, бяз-, бяс-) – [-j- э(а)]**: бяз-рыб'-е, без-зямелл-е*, бяс-праў-е, без-дарожж-а** і інш.; ***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -нік**: без-зямель-нік, бес-саром-нік, без-білет-нік* і інш. У дадзеным выпадку лексемы могуць матывавацца не толькі назоўнікамі з прыназоўнікамі *без зямлі, без сораму*, але і прыметнікамі *беззямельны і бессаромны,* тады ў якасці словаўтваральнага сродку будзе выступаць не конфікс, а суфікс **-нік**. Кожная з дзвюх матывацый, як бачым, мае свой знешні паказчык вытворнасці: назіраецца множнасць словаўтваральнай структуры слова;

***за- – -ак**: за-печ-ак, за-двор-ак;* ***за- – -нік**: за-ймен-нік;* ***за- – [-j- э]**: За-гор'-е, За-паляр'-е, за-межж-а*;*

***з- – -ак**: з-мыл-ак;*

***між- – [-j- э]**: між-мор'-е, між-гор'-е, між-броў-е;*

***на- – -ак**: на-пёрст-ак, на-ліс-нік, на-плеч-нік, на-морд-нік, на-хлеб-нік* і інш.; ***над- – -ак**: над-вячор-ак;* ***над- – [-j- э]**: над-хмар'-е;*

***па- – -ак**: па-гор-ак;* ***па- – -нік**: па-плеч-нік;*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***пад- – -ак:*** *пад-лет-ак, пад-печ-ак, пад-свін-ак, пад-жыл-ак;* ***пад- – -авік:*** *пад-асін-авік, пад-бяроз-авік;* ***пад- – -нік:*** *пад-акон-нік, пад-лакот-нік;*

***пера- – -ак:*** *пера-лес-ак;*

***перад- – -ак:*** *перад-крыл-ак;* ***перад- – [-j- э]:*** *перад-сэрдз-е*, перад-дзвер'-е;*

***пра- – -к-:*** *пра-слой-к-а;*

***пры- – -ак:*** *пры-скрын-ак, пры-печ-ак;* ***пры- – -ік:*** *пры-лазн-ік;* ***пры- – [-j- э]:*** *Пры-амур'-е, Пры-азоў-'е;* ***пры- – -нік:*** *пры-мыль-нік (II);*

***ус- – -ек:*** *ус-кра-ек;* ***уз- – [-j- э]:*** *уз-галоў-е, уз-мор'-е, уз-гор'-е, уз-лесс-е*, уз-бярэжж-а** і інш. У назоўніках, якія маюць памету *, суфіксальны гук [j] у працэсе дэрывацыі асіміляваўся з папярэднім зычным, таму ў якасці другога кампанента выступае нулявы суфікс.

Прыведзеныя тыпы з фармантамі **ад- – -ак; за- – -нік; з- – -ак-; над- – -ак; пера- – -ак; пра- – -к-; пры- – -ік; пры- – -нік; ус- – -ек** не маюць шырокага распаўсюджання ў сучаснай беларускай мове, паколькі выкарыстоўваюцца адзінкавыя прыклады лексем з названымі словаўтваральнымі конфіксамі (некаторыя ў гутарковым стылі).

Сярод адсубстантыўных прыметнікаў вылучаюцца больш разнастайныя, у параўнанні з назоўнікамі, словаўтваральныя тыпы (каля дваццаці) з пэўнымі падтыпамі ад'ектыўных конфіксных утварэнняў на І, радзей на ІІ (матывуюцца вытворнымі назоўнікамі) ступенях словаўтваральных ланцужкоў :

***аб- – -ан-:*** *аб-ветр-ан-ы*;* ***аб- – -ен-:*** *аб-вугл-ен-ы*, аб-смал-ен-ы*;*

***ад- – -н-:*** *ад-веч-н-ы*, ад-прыслоў-н-ы;* ***ад- – -ав-:*** *ад-займеннік-ав-ы (II), ад-вячорк-ав-ы (II), ад-прыметнік-ав-ы;*

***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -ав-:*** *без-вынік-ов-ы*, бес-паспях-ов-ы*, бяс-клас-ав-ы*, бес-прынцып-ов-ы* і інш.;* ***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -лів-:*** *без-гаспадар-лів-ы*;* ***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -н-:*** *бяз-грэш-ны*, без-білет-н-ы, бяс-кроў-н-ы, бяз-воль-н-ы, бяз-дон-н-ы, без-аргумент-н-ы, бес-каларый-н-ы*, бяз-мер-н-ы;* ***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -оўн-:*** *без-грунт-оўн-ы*, бес-такт-оўн-ы*, бес-прац-оўн-ы*;* ***без-(бес-, бяз-, бяс-) – -∅-*** (з нулявым другім кампанентам)***:*** *бяз-вус-ы, без-галов-ы, бяз-ног-і;* ***бяз— -к-:*** *бяз-važ-к-і;*

***да- – -енн-:*** *да-абедз-енн-ы, да-рэформ-енн-ы;* ***да- – -н-:*** *да-ваен-н-ы*, да-школь-н-ы*, да-рэвалюцый-н-ы, да-буквар-н-ы* і інш.;* ***да- – -оўск-(-ёўск-, -аўск-):*** *да-верасн-ёўск-і, да-пятр-оўск-і, да-сад-аўск-і;* ***да- – -ычн-:*** *да-гістар-ычн-ы;*

***за- – -н-:*** *за-воблач-н-ы, за-куліс-н-ы, за-вуш-н-ы, за-вуголь-н-ы, за-гарад-н-ы і інш. ;* ***за- – -ав-:*** *за-такт-ав-ы;*

***звыш- – -ав-:*** *звыш-план-ав-ы;*

***між- – -ав-:*** *між-від-ав-ы, між-бірж-ав-ы;* ***між- – -аўск-:*** *між-банк-аўск-і;* ***між- – -анск-:*** *між-рэспублік-анск-і;* ***між- – -н-:*** *між-раён-н-ы, між-народ-н-ы, між-гарод-н-і;*

***на- – -ан-:*** *на-бедр-ан-ы;* ***на- – -н-:*** *на-столь-н-ы, на-бераж-н-ы, на-дом-н-ы, на-канеч-н-ы, на-груд-н-ы* і інш;

***над- – -ав-(-ов-):*** *над-вячорк-ав-ы (II), над-радк-ов-ы (II);* ***над- – -н-:*** *над-гар-тан-н-ы, над-зем-н-ы, над-вячэр-н-і;* ***над- – -ск-:*** *над-нёман-ск-і;*

***не- (ня-) – -лів-:*** *не-пагод-лів-ы*;* ***не- (ня-) – -н-:*** *не-апетыт-н-ы*, ня-во-пыт-н-ы*, ня-він-н-ы, ня-знач-н-ы* і інш;*

***па- – -н-:*** *па-вобраз-н-ы, па-галоў-н-ы, па-гадзін-н-ы, па-асоб-н-ы, па-кватэр-н-ы, па-кварталь-н-ы, па-даход-н-ы; па-дарож-н-ы і інш.;*

***пад- – -ан-:*** *пад-ветр-ан-ы;* ***пад- – -н-:*** *пад-ключыч-н-ы, пад-вопыт-н-ы, пад-вод-н-ы, пад-зем-н-ы, пад-нябес-н-ы і інш.;*

***паза- – -ав-:*** *паза-час-ав-ы, паза-план-ав-ы, паза-клас-ав-ы;*

***паза- – -н-:*** *паза-штат-н-ы, паза-бюджэт-н-ы, паза-клас-н-ы, паза-атмасфер-н-ы, паза-школь-н-ы і інш.;*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***пасля- – -енн-:*** *пасля-абедз-енн-ы, пасля-рэформ-енн-ы;* ***пасля- – -н-:*** *пасля-ваен-н-ы;*

***перад- – -ав-:*** *перад-весн-ав-ы;* ***перад- – -енн-:*** *перад-абедз-енн-ы;* ***перад- – -н-:*** *перад-крызіс-н-ы, перад-вячэр-н-і, перад-навальніч-н-ы, перад-дыплом-н-ы і інш.;* ***перад- – -очн-:*** *перад-свят-очн-ы;*

***пры- – -н-:*** *пры-азёр-н-ы, пры-бярэж-н-ы, пры-гарад-н-ы, пры-граніч-н-ы, пры-двор-н-ы і інш.;* ***пры- – -оўск-:*** *пры-дняпр-оўск-і;*

***спрад- – -н-:*** *спрад-веч-н-ы;*

***су- – -н-:*** *су-мес-н-ы, су-час-н-ы;*

***супраць- – -н-(-енн-):*** *супраць-закон-н-ы, супраць-восп-енн-ы;*

***унутры- – -ав-(-ов-):*** *унутры-клас-ав-ы; унутры-від-ав-ы; унутры-галін-ов-ы;* ***унутры- – -н-:*** *унутры-атам-н-ы, унутры-клетач-н-ы, унутры-зем-н-ы.*

Дэрываты, якія маюць памету *, могуць матывавацца не толькі асновамі невытворных назоўнікаў, але і адсубстантыўных прыметнікаў (***бяз****-грэшны* ← *грэшны,* ***да****-школьны* ← *школьны* ) і будуць адносіцца да іншых словаўтваральных тыпаў з фармантамі прэфіксамі. У такіх выпадках ад'ектывы ўтвараюцца на II ступені словаўтваральнага ланцужка, у наступным словаўтваральным акце, напрыклад: *вайна* → *ваен-****н****-ы* → ***да****-ваенны; вынік* → *вынік-****ов****-ы* → ***без****-выніковы* і г.д. У падобных вытворных множнасць матывацыі знаходзіць сваё адлюстраванне ў словаўтваральнай структуры слова, у здольнасці яго па-рознаму чляніцца пры кожнай матывацыі.

Часцей за ўсё ўжываюцца ва ўсіх стылях мовы дэрывацыйныя тыпы прыметнікаў з фармантамі **без-(бес-, бяз-, бяс-) – -н-; за- – -н-; па- – -н-; перад- – -н-; пры- – -н-.**

Асаблівасцю дзеяслоўнай конфікснай дэрывацыі з'яўляюцца цыркумфіксы з вельмі актыўным першым кампанентам **абез-(абес-, абяз-, абяс-),** які ніколі не функцыянуе ў якасці асобнай дзеяслоўнай прыстаўкі, а такія прыстаўкі, як **да-, над-, неда-, са-, су-** не выкарыстоўваюцца як першы кампанент у складзе конфіксаў пры ўтварэнні дзеясловаў. Сярод вытворных адсубстантыўных дзеясловаў вылучаем каля пятнаццаці словаўтваральных тыпаў з падтыпамі:

***а- – -ава-:*** *а-фарб-ава-ць, а-штраф-ава-ць;* ***а- – -і-(-ы-):*** *а-цан-і-ць*, а-пар-ы-ць, а-паляч-ы-ць, а-каталіч-ы-ць, а-білец-і-ць* і інш.;

***аб-(-аба-) – -і-(-ы-):*** *аб-важ-ы-ць, аб-слін-і-ць, аб-надзе-і-ць, аб-смал-і-ць* (пакрыць смалой), *аба-знач-ы-ць;* ***аб- – -ава-:*** *аб-футр-ава-ць;*

***абез-(абес-, абяз-, абяс-)– -е-:*** *абяз-лес-е-ць, абяс-кров-е-ць, абяс-крыл-е-ць;* ***абез-(абес-, абяз-, абяс-)– -і-:*** *абяз-лес-і-ць, абяс-кров-і-ць, абяс-крыл-і-ць, абез-галов-і-ць, абяз-бол-і-ць, абяс-шкодз-і-ць, абяс-смерц-і-ць, абяз-збро-і-ць* і інш.;

***ад- – -ава-:*** *ад-меж-ава-ць, ад-карк-ава-ць, ад-фільтр-ава-ць*, ад-піл-ава-ць*, ад-памп-ава-ць* і інш.; ***ад- – -і-( -ы-):*** *ад-пар-ы-ць, ад-важ-ы-ць, ад-сла-і-ць, ад-футбол-і-ць* (разм.) і інш.;

***вы- – -ава-:*** *вы-піл-ава-ць, вы-карч-ава-ць, вы-брак-ава-ць;*

***вы- – -ы-:*** *вы-ветр-ы-ць, вы-пар-ы-ць;*

***з-(с-) – -ава-:*** *з-ніт-ава-ць, с-праект-ава-ць, з-гурт-ава-ць, з-нерв-ава-ць, з-банкрут-ава-ць* і інш.; ***з-(с-) – -і-(-ы-):*** *з-ран-і-ць, з-гна-і-ць, з-фальшыв-і-ць*(II);

***за- – -ава-(-ірава-):*** *за-шыфр-ава-ць, за-бінт-ава-ць, за-гарт-ава-ць, за-баран-ава-ць, за-бальзам-ірава-ць;*

***за- – -і-(-ы-):*** *за-шкл-і-ць, за-палан-іць, за-штор-ы-ць, за-кругл-і-ць і за-непако-і-ць* (II); ***за- – -а-(-э-):*** *за-сівер-а-ць, за- мш-э-ць;*

***па- – -ава-(-ява-):*** *па-бед-ава-ць, па-баран-ава-ць, па-тэлефан-ава-ць, па-габл-ява-ць;* ***па- – -і-(-ы-):*** *па-залац-і-ць*, па-серабр-ы-ць;*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***пад- – -і-:*** *пад-футбол-і-ць (разм.);*

***пра- – -ава-:*** *пра-штамп-ава-ць, пра-тэлеграф-ава-ць, пра-экзамен-ава-ць;*

***пра- – -і-:*** *пра-смал-і-ць;*

***пера- – -ава-:*** *пера-кіт-ава-ць, пера-бед-ава-ць;* ***пера- – -і-(-ы-):*** *пера-груз-і-ць*, пера-važ-ы-ць*, пера-кле-і-ць*;*

***пры- – -і-:*** *пры-зямл-і-ць, пры-лун-і-ць;*

***раз- (рас-) – -ава-:*** *рас-сарт-ава-ць, рас-фарб-ава-ць;* ***раз- (рас-) – -і-:*** *рас-пыл-і-ць, рас-супон-і-ць, рас-сакрэц-і-ць, раз-бамб-і-ць, раз-ахвоц-і-ць* і інш.; ***рас- – -е-:*** *рас-пан-е-ць;*

***у- – -ава-:*** *у-камплект-ава-ць, у-парадк-ава-ць;* ***у- – -і-:*** *у-закон-і-ць, у-вільгатн-і-ць*(ІІ);

**уз- – -ава-**: уз-бунт-ава-ць; **уз- – -ы-**: уз-важ-ы-ць.

Самымі ўжывальнымі можна лічыць дэрываты з такімі дзеяслоўнымі конфіксамі, як **а- – -і-(-ы-); абез-(абес-, абяз-, абяс-)– -і-; ад- – -ава-; ад- – -і-( -ы-); з-(с-) – -ава-; раз- (рас-) – -ава-.**

Пры словаўтварэнні дзеясловаў ад назоўнікаў канфіксацыя можа камбінавацца з постфіксацыяй. У якасці першага кампанента выступаюць **а-, ад-, за-, вы-, пра-, пры-, раз-(рас-)**, у якасці другога – былы суфікс з постфіксам **-і-цца (-ы-цца)** [8, с. 237], рэдка **-а-цца (-я-цца),** напрыклад: *а-тавар-ы-цца, а-пар-ы-цца, а-паяс-а-цца, ад-сла-і-цца, вы-ветр-ы-цца, вы-пагадз-і-цца, за-пыл-і-цца*, за-гна-і-цца*, пра-сляз-і-цца*, пра-штраф-і-цца, пра-він-і-цца, пры-цан-і-цца, пры-лун-і-цца, раз-магніц-і-цца, раз-вінц-і-цца, рас-пыл-я-цца, рас-цугл-я-цца* і інш.

Вытворным дзеясловам з паметай * уласціва множнасць словаўтваральнай структуры слова: некаторыя з іх могуць матывавацца і іншымі ўтваральнымі асновамі назоўнікаў, напрыклад: *ацан-і-ць ← ацэнка* ('даць *ацэнку*') – у якасці фарманта выкарыстоўваецца ўжо не конфікс, а суфікс **-і-**; дзеясловамі, напрыклад: ***пера****-грузіць← грузіць,* ***за****-пыліцца ← пыліцца* – утваральным сродкам будзе выступаць прэфікс.

У вытворных конфіксных назоўніках, прыметніках і дзеясловах на марфемным шве ўтваральнай асновы назоўніка і другога кампанента конфікса адбываюцца наступныя марфаналагічныя змены:

1. Чаргаванне канцавых зычных утваральнай і фармантнай частак слова, якое мае рэгрэсіўную накіраванасць, паколькі другі кампанент конфікса выклікае змены ва ўтваральнай аснове:

а) цвёрдай і мяккай фанем:*стол – настольнік, квартал – пакварта**льны**, воспа – супрацьвоспенны, абед – абедзенны, шкло – зашкліць, цана – ацаніць;*

б) **[г], [к], [х]** з **[ж], [ч], [ш]**: *бераг – узбярэжжа, дарога – падарожны, воблака – завоблачны, грэх– бязгрэшны, паляк – апалячыць, вага – пераважыць;*

в) губных са спалучэннямі "губны + [л']": **зямля** – падземны;

г) іншыя чаргаванні зычных: *ключыца – падключычны, галава – пагалоўе, пагалоўны, локаць – падлакотнік, магніт – размагніціць, шкода – абясшкодзіць;*

2. Адсячэнне фінальнай зычнай матывавальнай асновы назоўніка: *ліст – наліснік, месца – сумесны.*

3. Чаргаванні галосных **о,э – а**: *гара – пагорак, вечар – навячорак, вада – падводны, бядро – набедраны, вечарок – адвячоркавы, помпа – адпампаваць;* **о,э – ø** (нуль гука): *акно – падаконнік, радок – надрадковы, вецер – падветраны, мох – замшэць.*

Такім чынам, выдзяленне словаўтваральных тыпаў і падтыпаў праводзілася фармальна, з улікам такіх асноўных прыкмет, як наяўнасць аднолькавай утваральнай базы невытворнага, рэдка матываванага назоўніка, аднаго і таго ж ці падобнага (другі кампанент конфікса іншы) фарманта.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская граматыка: У 2 ч. / АН БССР. Ін-т мовазнаўства. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск / Рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба – 1985. – 431 с.
2. ***Белокриницкая С.С.*** Классификация словообразовательных гнезд от непроизводных существительных в русском языке // Проблемы структурной лингвистики. 1971. – М.: Наука, 1972. – С. 258-265.
3. ***Власов А.В.*** Терминология морфологии и словообразования в современных белорусском и русском языках (деривационная структура и систета термоединиц): Дисс. ... канд. филол. наук / Гомельский гос. ун-т. – Гомель, 1988. – 191 с.
4. ***Лукашанец А.А.*** Адзінкі словаўтварэння ў беларускай мове // Бел. лінгвістыка. – 1994 – Вып. 44. – С. 19-26.
5. ***Лукашанец А.А.*** Структурно-семантическая характеристика глагольных словообразовательных гнезд в белорусском языке // Деривационные типы и гнезда в синхронии и диахронии. Сб.науч.тр. – Владивосток: ДВО АН СССР, 1989. – С. 175-184.
6. ***Сцяцко П.У., Гуліцкі М.Ф., Антанюк Л.А.*** Слоўнік лінгвістычных тэрмінаў / Рэд. М.В. Бірыла, П.У. Сцяцко. – Мн.: Выш.школа, – 1990. – 231 с.
7. ***Тихонов А.Н.*** Словообразовательная мотивированность однокоренных слов // Русская словообразовательная синтагматика и парадигматика. Сб.науч.тр. – Краснодар: Кубанский гос.ун-т, 1991. – С.110-121.
8. ***Шакун Л.М.*** Словаўтварэнне: Вуч. дапам. для студэнтаў філал.фак. – Мн.: Выш.шк., 1978 . – 128 с.
9. ***Шуба П.П.*** Сучасная беларуская мова: Марфаналогія. Марфалогія. – Мн., 1987. – 334 с.



## SUMMARY

*The formative types and subtypes of derivatives, having a combination of affixes, are singled out in the system of the nouns, adjectives, verbs. A nature of formants disregarding their formative meanings was taken as a base of type distinguishing.*


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова